# НА СУСТРЭЧЫ ПРЭЗІДЭНТА І КІРАЎНІКА ЎРАДА БЫЛІ АБМЕРКАВАНЫ ВАЖНЕЙШЫЯ ПЫТАННІ ЖЫЦЦЯДЗЕЙНАСЦІ КРАІНЫ

Перспектывы супрацоўніцтва Беларусі з Расіяй і Украінай, а таксама актуальныя пытанні падрыхтоўкі народнагаспадарчага комплексу да зімовага перыяду сталі асноўнай тэмай даклада прэм'ер-міністра краіны Сяргея Лінга прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку. Аб гэтым кіраўнік беларускага ўрада паведаміў у інтэрв'ю шэрагу прадстаўнікоў айчынных сродкаў масавай інфармацыі.

Паводле слоў Сяргея Лінга, на сустрэчы было абмеркавана шырокае кола пытанняў. У першую чаргу яны датычылі стварэння спрыяльных умоў для работы рэальнага сектара эканомікі: нарошчвання тэмпаў выпуску прадукцыі, захавання і асваення новых рынкаў збыту.

Асаблівая ўвага ў развіцці эканамічнага супрацоўніцтва, лічыць кіраўнік беларускага ўрада, павінна ўдзяляцца дзвюм суседнім дзяржавам — Расіі і Украіне.

У час нядаўняга візіту прэм'ер-міністра Расіі Яўгена Прымакова ўдалося намеціць шэраг канкрэтных дамоўленасцяў, прапрацоўка якіх вядзецца цяпер. Паводле слоў Сяргея Лінга, знойдзены ўзаемапрымальныя варыянты разлікаў за расійскі газ, што пастаўляецца. Акрамя таго, вырашаецца праблема выдзялення першага транша тэхнічнага крэдыту для Яраслаўскага АТ «Аўтадызель», каб ён змог забяспечыць стабільныя паступленні матораў для айчыннай аўтамабільнай прамысловасці. Таксама падрыхтавана рашэнне па пастаўцы з суседняй дзяржавы алмазаў.

Прэзідэнтам Беларусі, паведаміў кіраўнік урада, адобраны ход падрыхтоўкі да пасяджэння Выканкама Саюза Беларусі і Расіі, якое адбудзецца 16 кастрычніка. Сяргей Лінг у ходзе візіту плануе правесці сустрэчу з прэм'ер-міністрам Расіі Яўгенам Прымаковым. Там жа, паводле слоў кіраўніка беларускага ўрада, павінна адбыцца сустрэча з мэрам Масквы Юрыем Лужковым. У беларускіх вытворцаў наладжаны цесныя эканамічныя кантакты са сталічнымі прамыслоўцамі Расіі.

Кіраўнік урада спыніўся і на пытаннях супрацоўніцтва рэспублікі з Украінай. У ходзе нядаўна праведзенага візіту дэлегацыі нашай дзяржавы ў гэту краіну і сустрэч з прэзідэнтам Леанідам Кучмам і прэм'ер-міністрам Валерыем Пуставойценкам былі абмеркаваны важнейшыя пытанні эканамічнага ўзаемадзеяння. Тавараабарот паміж дзвюма краінамі складае адзін мільярд долараў ЗША. Гэта, на думку Сяргея Лінга, яўна не адпавядае эканамічным патэнцыялам дзвюх дзяржаў.

У ходзе праведзеных сустрэч удалося дасягнуць пэўных дамоўленасцяў. У прыватнасці, урадам Украіны адменена забарона на правядзенне бартэрных аперацый. Акрамя таго, вызначаны пералік дзесяці назваў тавараў, абмен якімі будзе ажыццяўляцца ў рамках падпісанага пагаднення паміж канцэрнам «Белрэсурсы» і яго ўкраінскім партнёрам. Было таксама дасягнута пагадненне аб фінансаванні на ўрадавым узроўні сумеснай праграмы вытворчасці сельскагаспадарчай тэхнікі пры непасрэдным удзеле нашага прадпрыемства — ВА «Гомсельмаш». Украінскі бок праявіў зацікаўленасць у прадукцыі ВА «БелАЗ».

Акрамя таго, абмеркаваны шэраг іншых важных праблем беларуска-ўкраінскага супрацоўніцтва. У прыватнасці, бакі змаглі знайсці агульныя пункты па пытанню доўгу ўкраінскай дзяржавы нашай рэспубліцы, які на сённяшні дзень складае 217 мільёнаў долараў ЗША. Агаворваны таксама і магчымасці зняцця абмежаванняў на гандаль паміж дзвюма краінамі. Паводле слоў Сяргея Лінга, плануецца падпісанне адпаведнага пагаднення нарэшце гэтага.

Кіраўнік беларускага ўрада адзначыў, што ў час сустрэчы з прэзідэнтам Украіны было адобрана правядзенне рэгулярных, раз у квартал, сустрэч на ўрадавым узроўні, дзе абмяркоўваліся б надзённыя праблемы.

Сяргей Лінг лічыць, што важным укладам у развіццё беларуска-ўкраінскіх адносінаў з'яўляецца падпісанне пагаднення аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве тэрмінам на дзесяць гадоў, якое цяпер знаходзіцца на зацвярджэнні ў кіраўніка беларускай дзяржавы.

Нядаўна адбыўся візіт афіцыйнай дэлегацыі аўтаномнай Рэспублікі Крым. У хуткім часе нашу сталіцу наведаюць прадстаўнікі Кіеўскай вобласці, а гамяльчане запрасілі да сябе кіраўніцтва і прадстаўнікоў дзелавых колаў Чарнігаўскай вобласці. Адносіны на рэгіянальным узроўні будуць пашырацца.

Затым прэм'ер-міністр паведаміў аб тым, што ў ходзе сустрэчы з кіраўніком беларускай дзяржавы ён далажыў аб выніках работы народнай гаспадаркі краіны. Паводле яго слоў, нягледзячы на ўсе цяжкасці, якія перажывае наша прамысловасць, гэты сектар эканомікі за дзевяць месяцаў сёлетняга года ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага павялічыў аб'ём выпрацаванай прадукцыі на 10,8 працэнта. Прэм'ер-міністр акцэнтаваў увагу на эканомным выкарыстанні валютных сродкаў. Акрамя таго, ён адзначыў неабходнасць скарачэння бартэрных аперацый.

Сур'ёзную заклапочанасць прэзідэнта Беларусі выклікае ход сельскагаспадарчых работ у рэспубліцы, паведаміў прэм'ер-міністр. Аграрны сектар краіны перажывае вялікія цяжкасці, звязаныя з дрэннымі ўмовамі надвор'я. Але, нягледзячы на гэта, удалося сабраць больш як пяць мільёнаў тон збожжавых культур. Пасевы азімыя. Аднак на полі застаюцца няўбранымі амаль 25 працэнтаў бульбы, 85 працэнтаў буракоў і іншых караняплодаў, а таксама 18 працэнтаў ільну. Збор гэтага ўраджаю, на думку прэм'ер-міністра, вядзецца недастатковымі тэмпамі. Таму прынята рашэнне правераць некалькі гаспадарак рэспублікі. Перад Міністэрствам сельскай гаспадаркі і харчавання стаіць задача арганізаваць работы такім чынам, каб укласціся ў дзесяцідзённы тэрмін.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы